## Білет 24

**Практычнае заданне.**

**Гаспадарчае жыццё беларускіх зямель у IX–XIII стст. Шляхі ўзнікнення гарадоў, іх роля.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Назавіце пяць гарадоў, якія ўзніклі на беларускіх землях адпаведна ў IX, X, XI, XII, XIII стст.
2. Што экспартавалі беларускія землі ў IX–XIII стст.?
3. Складзіце схему "Асноўныя гаспадарчыя заняткі ўсходніх славян у IX–XIII стст.". Якія змены адбываліся ў гаспадарцы ўсходніх славян у гэты перыяд?
4. Як узнікалі гарады ў сярэднявеччы? Якую ролю яны выконвалі?

### I. Картасхема “Старажытныя беларускія гарады”




| | |
|---|---|
| 1147 | Гады першага ўспаміну гарадоў у пісьмовых крыніцах |
| | Гарадзішчы старажытнарускага часу, якія выяўлены археолагамі |
| | Найбольш важныя гандлёвыя шляхі |
| | Волакі |
| | Гандаль беларускіх гарадоў (з указаннем напрамку і тавараў) |

**II. Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель у IX–XIII стст.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. 6 клас»).*

Жыццё нашых продкаў у Сярэднявеччы было вельмі цяжкім. Пражыць паасобку ці невялікімі сем'ямі ў той час было складана. Сумесная дзейнасць патрабавалася пры расчыстцы ўчасткаў лесу для земляробства, карчаванні пнёў, розных палявых работах. Таму ўсходнія славяне жылі калектывамі - суседскімі абшчынамі. Абшчына ва ўсходніх славян называлася «верв». Уся зямля, якая апрацоўвалася ці выкарыстоўвалася для выпасу жывёлы, належала абшчыне.

Галоўнымі заняткамі ўсходніх славян былі земляробства і жывёлагадоўля. Да XIII ст. падсечна-агнявое земляробства было выцеснена ворыўным у форме двуполля і трехполья. Больш шырокае распаўсюджванне атрымала двуполле. Пры сістэме земляробства, якая атрымала назву "трохполле", поле дзялілася на тры часткі. Адна трэць засявалася яравымі, другая - азімымі, а трэцяй даваўся адпачынак. На беларускіх землях былі распаўсюджаны многія вядомыя ў наш час культуры: пшаніца, проса, жыта, бабы, гарох, грэчка. Для вырабу тканіны вырошчвалі лён і каноплі. Ураджай зжыналі жалезнымі сярпамі або косамі. Збожжа малацілі драўлянымі цэпамі і малолі ў муку пры дапамозе каменных жорнаў. Разводзілі кароў, коней, свіней, коз, авечак.

Важнымі заняткамі для нашых продкаў заставаліся паляванне і рыбная лоўля. Палявалі на ласёў, зуброў, аленяў, дзікоў, мядзведзяў і інш. Здабывалі таксама футра пушных звяроў. Лясныя багацці - ягады, грыбы - дапаўнялі стол земляроба.

Шырокае распаўсюджванне мела бортніцтва. Збор мёда дзікіх пчол быў не меней складаным, чым паляванне. Мёд і воск тады высока шанаваліся: на іх быў вялікі попыт у Візантыі і іншых краінах.

Самыя простыя рэчы, неабходныя ў паўсядзённым жыцці, выраблялі ў кожнай хаце. Так, напрыклад, амаль усе жанчыны ўмелі прасці і ткаць. Складаныя рэчы, асабліва з металу, рабілі рамеснікі, якія меліся амаль у кожнай вёсцы. Вясковыя жыхары амаль поўнасцю забяспечвалі сябе ўсім неабходным для жыцця. На беларускіх землях доўгі час панавала натуральная гаспадарка.

**III. Схема. Узнікненне гарадоў і іх роля ў сярэднявеччы**

